АКЦЫІ




# ТАК БУДЗЕ ЗАЎСЁДЫ

**Сёмы год запар на Гродзеншчыне праходзіць грамадска-літаратурная акцыя «Пад мірным небам Беларусі» – ініцыятыва гродзенскіх пісьменнікаў. У рамках акцыі традыцыйна адбываецца шэраг публічных літаратурных мерапрыемстваў, прысвечаных святу Вялікай Перамогі. У цэнтры ўвагі – ваенна-патрыятычная тэматыка.**



5 мая ў канферэнц-зале Гродзенскай абласной навуковай бібліятэкі імя Я. Ф. Карскага адбылося пасяджэнне прысвечанай Дню Перамогі літаратурнай гасцёўні з удзелам гродзенскіх творцаў – прадстаўнікоў Гродзенскага абласнога аддзялення СПБ і іх сяброў. У літаратурным блоку праграмы «Святкуем Дзень Перамогі разам!» са сваёй грамадзянскай лірыкай выступілі члены СПБ, паэты Браніслаў Ермашкевіч, Рыгор Гармаш, Людміла Шаўчэнка, Анатоль Апанасевіч, Андрэй Татур, Дзмітрый Радзівончык (прачытаў творы калегі па СПБ, паэта Віктара Куца), а таксама паэтэсы-аматары Кацярына Ігнацюк, Юлія Раманюк і празаік Ірына Салата. Вядучыя літаратурнай гасцёўні – загадчык універсальнай чытальнай залы М. У. Болдак і старшыня ГрАА СПБ, паэтэса Людміла Кебіч.

На святочнай сустрэчы з сучасным мастацкім словам і яго аўтарамі прысутнічалі не менш сучасныя і прагрэсіўныя прыхільнікі творчасці і прыгажосці, студэнты Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Я. Купалы. З дыкламацыяй ваенна-патрыятычнай лірыкі XX стагоддзя (Э. Асадаў «Радзіме», В. Тушнова «Лялька») выступілі чытальнікі, навучэнцы Дзіцячай школы мастацтваў імя А. Тызенгаўза Канаразаў Вячаслаў і Кісель Дар’я. Песня «Я жыву ў запаведным краю» прагучала ў выкананні Калеснічэнка Веры.

Як адзначыла кіраўнік пісьменніцкай арганізацыі вобласці Людміла Антонаўна Кебіч, сёння няма беларуса, чыёй сям'і сваім полымем не кранула б вайна. Таму Дзень Перамогі зблізкае вельмі

розных людзей, злучае пакаленні. А будаўнічым матэрыялам для гэтага падмурка служыць памяць пра подзвіг народа-вызваліцеля, якую мы абавязаны захоўваць і перадаваць будучым пакаленням. Мы павінны быць годнымі гэтай памяці, каб не здрадзіць святой справе нашых бацькоў і дзедаў – справе абароны Айчыны. Пра гэты свяшчэнны абавязак кожнага грамадзяніна, кожнага сапраўднага патрыёта, кожнага сапраўднага мужчыны ў сваёй прамове нагадаў спецыяльны госць мерапрыемства, прадстаўнік вайсковай часткі № 5522, намеснік камандзіра роты па ідэалагічнай рабоце Дашкевіч Андрэй Аляксандравіч.

У кожным прачытаным аўтарамі і чытальнікамі творы лейтматывам гучала тэма славы вялікаму подзвігу савецкага народа, якому ўдалося перамагчы фашызм у 1945-м годзе. У прамове кожнага выступоўцы знаходзілася месца і для асабістых уражанняў і перажыванняў. Пра лёс сваёй шматпакутнай радзімы Украіны гаварыў гродзенскі паэт Рыгор Гармаш, гаварыў з болем, таму што ў ходзе абстрэла на Данбасе страціў сваіх родных. Але ў прачытаных Рыгорам Сцяпанавічам аўтарскіх вершах гучыць галоўнае для ўсіх нас – надзея.

На такіх мерапрыемствах вельмі важная прысутнасць моладзі. Ад таго, якія высновы зробяць маладыя людзі сёння, якімі стануць патрыётамі, барацьбітамі за гістарычную праўду, залежыць наша з вамі агульная будучыня. Нездарма напярэдадні Дня Перамогі фарміраванню светапогляду нашых маладых суграмадзян спрыяла мастацтва слова. Слова надзеі і веры, слова аб любові да радзімы, аб сіле чалавечага духу і славянскай еднасці. І так будзе заўсёды.

**ПРЭС-СЛУЖБА СПБ-ГРОДНА**

**На фота:** эпізоды літаратурнай гасцёўні «Святкуем Дзень Перамогі разам!» у рамках грамадска-літаратурнай акцыі «Пад мірным небам Беларусі». Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я. Ф. Карскага, 5 мая 2022 года.




Вядучыя літаратурнай гасцёўні – загадчык універсальнай чытальнай залы М. У. Болдак




Слова мае старшыня ГрАА СПБ Л. А. Кебіч






Браніслаў Ермашкевіч

Людміла Шаўчэнка



Андрэй Татур



Анатоль Апанасевіч



Рыгор Гармаш



Дзмітрый Радзівончык



Кацярына Ігнацюк



Юлія Раманюк



Ірына Салата

